# БЕЛАРУСЬ У ІНТЭРНЭТ-ПРАСТОРЫ

*Каралёў М. Д. Бельскі М. В.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Пятрова Н.Я. – к.філал.н.,дацэнт*

У рабоце разглядаюцца асаблівасці сеткі інтэрнэт на Беларусі. Вызначаецца яе роля ў нашай краіне. Робіцца выснова аб выключнай важнасці такога сродку для Беларусі. Таксама разглядаюцца найбольш папулярныя беларускія сайты, звяртаецца ўвага на іх адметнасці.

Інтэрнэт дазваляе людзям атрымліваць доступ да разнастайнай інфармацыі, прадаваць і купляць тавары і паслугі, займацца бізнесам, выяўляць свае таленты, выказваць асабістыя думкі і многае іншае. Гэта незменная частка сучаснага грамадства, якая ўзнікла як рэвалюцыйны тэхналагічны сродак. Інтэрнэт, ці глабальная сетка, злучае карыстальнікаў з усіх куткоў свету і займае асабліва важнае месца не толькі ў сферы навукі і вытворчасці, але і паўсядзённым чалавечым жыцці, маючы велізарную ролю ў розных галінах, даючы доступ да неверагоднай колькасці інфармацыі.

Інтэрнэт спрыяе развіццю розных аспектаў чалавечага жыцця, уключаючы вытворчасць, гандаль, адукацыю, эканоміку, культуру і інш. З'яўленне глабальнай сеткі выклікала развіццё IT-сферы, новых спецыяльнасцей і галін, пашырыла магчымасці ў сегменце паслуг і многае іншае. Наша праца прысвечана разгляду беларускай частцы сетцы інтэрнэт.

Спачатку вызначым, што такое інтэрнэт. Інтэрнэт – гэта глабальная сістэма ўзаемазвязаных камп'ютарных сетак, якая выкарыстоўвае набор інтэрнэт-пратаколаў (TCP/IP) для сувязі паміж сеткамі і прыладамі [1]. Інтэрнэт, які прадастаўляе мноства розных інфармацыйных рэсурсаў і паслуг на тэрыторыі Беларусі называецца Байнэтам. Існуе таксама альтэрнатыўная назва Белнэт, скарачэнне ад «Беларускі Інтэрнэт» [2]. Але апошняе найменне не распаўсюджана.

Безумоўна, інтэрнэт з'яўляецца вельмі важнай часткай на Беларусі. Доказам гэтаму служаць шматлікія аналізы, даклады і іншыя дакументы ад дзяржаўных апаратаў, камітэтаў і розных міністэрстваў. Напрыклад, Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь штомесяц і штогод публікуе статыстыку па сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на Беларусі. На малюнку 1 можна ўбачыць дадзеныя за 2022 г.:




Малюнак 1 – Удзельная вага насельніцтва, што выкарыстоўвае сетку інтэрнэт у 2022 г.

Мы зрабілі выбарку найлепшых беларускіх сайтаў сярод пераможцаў інтэрнэт-прэміі "Tibo" ў 2022–2023 г. [3] і спынімся на іх асаблівасцях.

Інтэрнэт-прэмія ТІБО праводзіцца ў Беларусі штогод з 2003 г. Асноўныя мэты конкурсу – садзейнічанне станаўленню і развіццю беларускага сектара сеткі інтэрнэт, развіццю і ўкараненню новых інфармацыйных тэхналогій і прапаганда лепшых дасягненняў Байнэту. Праекты ацэньваліся па розных крытэрыях, пачынаючы ад візуальнай працы сайта (ці ёсць у яго мабільная версія, ці карэктна адлюстроўваецца інфармацыя на планшэце і тэлефоне, ці правільны пераклад з рускай на беларускую ці англійскую і інш .) да актуальнасці (ці абнаўляецца інфармацыя, ці размяшчаюццаі навіны і т. п.) [4].

У табліцы 1 прадстаўлена інфармацыя па прыкладнай наведвальнасці беларускіх сайтаў за месяц у 2022 г..

Табліца 1 – Папулярнасць беларускіх сайтаў.

| Назва сайта | Інтэрнэт-рэсурс | Наведвальнасць сайта за месяц | Назва | Інтэрнэт-рэсурс | Наведвальнасць сайтаў за месяц |
|---|---|---|---|---|---|
| vpk.gov.by | Камітэт РБ | 8,5 тыс. | pnevmoteh.by | Інтэрнэт-крама | 301,4 тыс. |
| mchs.gov.by | МНС Беларусі | 876,6 тыс. | evroopt.by | Інтэрнэт-крама | 1.557M |
| min.trans.gov.by | Міністэрства РБ | 115,2 тыс. | travelagency.by | Турагенства | 42,3 тыс. |
| 1prof.by | Федэрацыі РБ | 3.075M | pac.by | Акадэмія РБ | 221,7 тыс. |
| ont.by | СМІ | 8.859M | fingramota.by | Інтэрнэт-партал | 110,8 тыс. |
| minsknews.by | СМІ | 6.034M | sb.bsu.by | Інстытут РБ | 783 тыс. |
| forumpravo.by | Прававы форум | 134,7 тыс. | belarusbank.by | Банк | 4.938M |
| belpost.by | Паштовы аператар РБ | 4.341M | energo.by | Сайт Белэнерго | 167,9 тыс. |

Даследаваўшы абраныя рэсурсы (гл. табліцу 1) і сабраўшы статыстыку па іх, мы зрабілі аналіз трафікаў абраных сайтаў (гл. малюнак 2):




Малюнак 2 – Суадносіны доляў трафіку за месяц для беларускіх інтэрнэт-рэсурсаў

З абраных беларускіх інтэрнэт-рэсурсаў найбольш папулярным з'яўляюцца навасныя сайты і такія інтэрнэт-рэрсурсы, як сайт тэлеканала ОНТ, інфармацыйне агенства "Минск- новости", інтэрнэт-партал 1prof.by. Пасля іх карыстаюцца папулярнасцю карпаратыўныя інтэрнэт-рэсурсы: Беларусьбанк, сайт Белпошты і сайты інтэрнэт-крам, напрыклад, evroopt.by. Сайты органаў дзяржаўнай улады, а таксама інтэрнэт-рэсурсы, прысвечанныя адукацыі і навуцы, менш папуярны. Гэту статыстыку можна наглядна ўбачыць на малюнку 3:




Малюнак 3 – Суадносіны доляў трафіку па катэгорыях

Можна зрабіць выснову, што інфармацыйныя інтэрнэт-рэсурсы з'яўляюцца аднымі з самых запатрабаваных у беларускай інтэрнэт-прасторы. Таксама для Байнэту важным з'яўляецца інтэрнэт-трафік арганізацый, а менавіта: выкарыстанне лічбавых тэхналогій, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, інтэрнэт-прадукцыя гэтых арганізацый і статыстыка выкарыстання лічбавых тэхналогій. Доказам могуць служыць леташнія гадавыя дадзеныя, апублікаваныя на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта РБ (Белсат) [5].

Як вядома, моўная сітуацыя на Беларусі характарызуецца наяўнасцю білінгвізму. У нашай краіне пашырана вуснае і пісьмовае руска-беларускае двумоўе. Гэта адлюстроўваецца і ў інтэрнэт-асяроддзі. Многія сайты функцыянуць і на рускай мове, і на беларускай. На малюнку 4 паказана колькасць такіх рэсурсаў:




Малюнак 4 – Моўнае прадстаўленне сайтаў Байнэту

Звернем увагу, што падтрымку беларускай мовы ў асноўным маюць сайты, прысвечаныя адукацыі, навуцы, а таксама сайты органаў дзяржаўнай улады і кіравання. Напрыклад, сайт нашага ўніверсітэта, БДУІР, мае беларускамоўную версію. Змест і функцыянал рускага і беларускага варыянтаў не заўсёды аднолькавы на абедзвюх мовах. Частка сайтаў на рускай мове абнаўляеццабольш хутка, чым на беларускай. Лічым гэта недахопам і раім сачыць за абнаўленнямі і на беларукіх версіях.

Такім чынам, найбольш папулярнымі беларускімі рэсурсамі глабальнай сеткі з'яўляюцца сайты навін і дзяржаўных арганізацый. Часцей яны існуюць у версіях на рускай і беларускай мовах. Папулярнымі з'яўляюцца сайты беларускіх інтэрнэт-крам, але часцей яны функцыянуць толькі па-руску. Сам жа інтэрнэт з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця сучаснага беларускага насельніцтва, і зараз уявіць без яго жыццё становіцца немагчыма.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Интернет – понятие, структура и источники. Словари и энциклопедии на Академике [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://znanierussia.ru/articles/%D0%98%D0%BD%D1%82%D0%B5%D1%80%D0%BD%D0%B5%D1%82. – Дата доступа: 19.11.2023.*

*2. Байнет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%91%D0%B0%D0%B9%D0%BD%D0%B5%D1%82. – Дата доступа: 20.11.2023.*

*3. Итоги интернет-премии ТИБО [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://tibo.by/tibo-2022-den-5-hronika-sobytij/. – Дата доступа: 20.11.2023.*

*4. Белта о премии ТИБО [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://tibo.by/tibo-2022-den-5-hronika-sobytij/. – Дата доступа: 20.11.2023.*

*5. Годовые данные по интернету до 2022 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/makroekonomika-i-okruzhayushchaya-sreda/informatsionno-telekommunikatsionnye-tekhnologii/godovye-dannye/index.php?sphrase_id=1968789. – Дата доступа: 20.11.2023.*